з моманту рэалізацыі сваіх здольнасцей робіць першы крок да дасягнення галоўнай жыццёвай мэты — самасцвярджэння свайго «Я» праз ажыццяўленне асобых задаткаў і здольнасцей.

**Грынкевіч Н.П.,**
*дацэнт*

## СТЫМУЛЯВАННЕ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НА ЗАНЯТКАХ ПА ЗАМЕЖНАЙ МОВЕ ЯК СРОДАК РАЗВІЦЦЯ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ

Неабходнай умовай павышэння ўзроўню эфектыўнасці працэсу навучання ў вышэйшай школе з'яўляецца стымуляванне пазнавальнай дзейнасці студэнтаў. Для гэтага неабходны ўдасканаленне метадаў і арганізацыйных формаў вучэбнай працы.

Па праблеме стымулявання пазнавальнай дзейнасці ў навучальным працэсе праведзена нямала даследаванняў, у якіх разгледжаны асобныя аспекты гэтай праблемы. Даследаванні сведчаць аб яе складанасці і шматграннасці. Стымуляванне пазнавальнай дзейнасці накіравана на развіццё пошукавых і творчых здольнасцей.

Даследчыкі праблемы педагагічнага стымулявання (Л.Ю.Гордзін, З.І.Раўкін, В.П.Шуман, Г.І.Шчукіна і інш.) разглядаюць стымулы як сродкі, якія вымушаюць людзей да больш эфектыўнай дзейнасці і аказваюць безумоўнае ўздзеянне на сістэму матываў, выконваюць ролю паскаральнікаў дынамікі патрабаванняў чалавека. Адсюль вынікае, што галоўная задача педагагічных стымулаў, што выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе,— выклікаць і развіць матывы, якія адпавядаюць мэтам і сутнасці пазнавальнай дзейнасці студэнтаў.

Педагагічныя стымулы бываюць знешнія (непасрэдныя) і ўнутраныя (апасродкаваныя). Знешнія стымулы ў педагагічным працэсе дзейнічаюць праз унутраныя. Знешнія стымулы пазнавальнай дзейнасці студэнтаў можна назваць арганізацыйна-педагагічнымі. Гэта пэўныя сродкі і спосабы педагагічнага ўздзеяння, якія выкарыстоўваюцца выкладчыкам у навучальным працэсе з мэтай уплыву на псіхічнае развіццё студэнта. Да ўнутраных стымулаў адносяцца такія, якія мабілізуюць разумовыя і валявыя працэсы, напрыклад цікавасць да ведаў, імкненне да пашырэння і паглыблення ведаў, патрэбнасць у вывучэнні прадмета ці з'явы і інш. Калі ўнутраныя стымулы пераважаюць над знешнімі, то гэта дазваляе актывізаваць пазнавальную дзейнасць студэнтаў, больш эфектыўна ўплываць на развіццё іх творчых здольнасцей.

На стымуляванне пазнавальнай дзейнасці студэнтаў могуць уздзейнічаць розныя фактары: змест вучэбнага матэрыялу, метады навучання, арганізацыйныя формы, асоба выкладчыка і інш. Таму асабліва важным мы лічым выяўленне найбольш перспектыўных накірункаў у вырашэнні гэтай праблемы. Вядучым сродкам стымулявання пазнавальнай дзейнасці студэнтаў з'яўляецца праблемнае навучанне. Асноўнай катэгорыяй такога навучання мы лічым праблемную сітуацыю. Яна фарміруецца з дапамогай задання, якое патрабуе адкрыць, засвоіць раней невядомыя веды, выкарыстаць на практыцы. Для ажыццяўлення гэтага неабходна вялікая інтэлектуальная актыўнасць навучэнцаў, іх творчая разумовая дзейнасць.

Вопыт выкладання замежнай мовы пераконвае, што праблемны падыход можа ажыццяўляцца на любым этапе навучання. Праблемныя заданні выкарыстоўваюцца намі пры навучанні дыялагічнай і маналагічнай мове. Мы выкарыстоўваем так званую «практычную творчасць», гэта значыць «пошук спосабу прымянення вядомых ведаў у новай сітуацыі». У аснове гэтага віду праблемнага навучання ляжаць пастаноўка і вырашэнне практычных вучэбных праблем. Пад творчымі заданнямі мы разумеем заданні, якія накіраваны на развіццё творчых здольнасцей студэнтаў (творчага стылю мыслення, уменняў актуалізаваць ранейшыя веды, абагульняць і сістэматызаваць іх, творча выкарыстоўваць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

атрыманыя веды ў новых умовах і сітуацыях). Своеасаблівасць методыкі выкарыстання творчых заданняў праблемнага характару абумоўліваецца псіхалагічнымі і педагагічнымі асаблівасцямі творчай дзейнасці, якая абавязкова звязана з навізной, цікавасцю і эмацыянальнай актыўнасцю навучэнцаў.

При навучанні маналагічнай мове спачатку прапануюцца часткова праблемныя заданні, мэта якіх — развіццё інтэлектуальных, эўрыстычных і творчых здольнасцей студэнтаў.

Напрыклад:

— перанесці падзеі, апісаныя ў тэксце, у другую часавую плоскасць;

— уявіць сябе ў ролі дзеючай асобы і пераказаць тэкст ад свайго імя;

— даць характарыстыку дзеючых асоб з выкарыстаннем раней вывучанага матэрыялу;

— прадоўжыць раней пачаты расказ, надаць яму лагічнае завяршэнне;

— змяніць змест тэксту з выкарыстаннем новых дзеючых асоб і інш.

Галоўным элементам праблемнай сітуацыі лічыцца новае, суб'ектыўна незнаёмае, тое, што павінна быць адкрыта для правільнага выканання задання і дзеяння. Стварыць такую сітуацыю ў працэсе навучання можна тады, калі навучэнцы ўжо выконвалі заданні пэўнай цяжкасці, якія патрабавалі ўжо творчай разумовай дзейнасці.

На занятках па замежнай мове мы выкарыстоўваем сітуацыі праблемнага характару, якія ў вучэбных мэтах класіфікуем наступным чынам: а) вузка-тэматычныя, б) асабістага плана, в) прафесійнага плана.

Пад вузка тэматычнымі разумеем такія, якія па праблематыцы звязаны з пэўнай тэмай. Пры вывучэнні тэмы «Сістэма адукацыі ў Вялікабрытаніі» студэнты выконваюць наступныя заданні.

— Раскажыце, якія формы навучання існуюць ва універсітэтах Вялікабрытаніі.

— Параўнайце падрыхтоўку студэнтаў у каледжах і універсітэтах гэтай краіны.

— Як праходзіць адбор навучэнцаў у вышэйшыя навучальныя ўстановы Вялікабрытаніі? У чым яго адрозненне ад адбору ў нашай краіне?

Сітуацыі асабістага плана звязаны, як правіла, з адчуваннямі і поглядамі самога студэнта. Напрыклад, пры вывучэнні краязнаўчай тэмы «Славутасці Лондана» студэнты выконваюць наступныя заданні.

— Уявіце сябе ў ролі экскурсавода. Прапануйце маршрут экскурсіі. Растлумачце, чаму вы рашылі наведаць гэтыя славутыя мясціны.

— Уявіце сябе ў ролі турыста, які ўпершыню прыехаў ў Лондан. Вы жадаеце як мага больш набыць інфармацыі. Якія пытанні Вы будзеце задаваць гіду?

— Ваш калега быў у Лондане ў камандзіроўцы. Быў там упершыню. Спытайце яго аб уражаннях.

— Аднойчы перад паездкай у Лондан Вы вырашылі наведаць вышага сябра, які быў у гэтым горадзе некалькі разоў. Спытайце яго аб гістарычных помніках і славутасцях сталіцы Вялікабрытаніі.

— Ваш сябар прыехаў у Лондан. Гэта яго першая паездка. Сёння вы яго гід. Вы пакажаце яму славутыя мясціны горада.

Сітуацыі прафесійнага плана і іх вырашэнне маюць на мэце фарміраванне прафесійных здольнастей студэнтаў.

Студэнтам факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм мы прапануем праблемныя заданні, звязаныя з іх будучай прафесійнай дзейнасцю.

— Вы павінны правесці экскурсію па бібліятэцы. Абмяркуйце. Што вы будзеце расказваць аб рабоце абанемента і даведачнага аддзела бібліятэкі?

— Распрацуйце наступную сітуацыю. Неабходна правесці экскурсію па бібліятэцы нашага універсітэта. Адзін студэнт выступае ў ролі гіда, а астатнія — у ролі наведвальнікаў. Гід праводзіць уступную гутарку, а наведвальнікі звяртаюцца да яго з пытаннямі.

— Паспрабуйце пераканаць Вашага сябра, што лепш працаваць у чытальнай зале бібліятэкі, чым дома.

— Уявіце сабе, што Вы больш вопытны чытач, чым ваш сябар. Што б Вы параілі яму зрабіць, калі б ён хацеў: а) атрымаць інфармацыю па апошніх даследаваннях па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пэўнай праблеме; б) праверыць, ці знаходзіцца кніга ў фондзе; в) пачаць працаваць над новай складанай тэмай; г) правесці даследаванне па дадзенай праблеме.

Праблемныя сітуацыі па тэме «Тэатр» на факультэце культуралогіі могуць быць наступныя.

— Раскажыце, у якой паслядоўнасці ідзе праца над п'есай, што рыхтуецца да пастаноўкі.

— Група гасцей з Англіі цікавіцца тэатральным жыццем сталіцы. Што Вы раскажаце? Які тэатр прапануеце наведаць?

— Паспрабуйце ўзяць інтэрв'ю ў вядомага акцёра.

— Уявіце сабе ў ролі артыста (артысткі) тэатра. Раскажыце аб сваім творчым шляху, аб любімых ролях.

— Уявіце сабе, што вы рэжысёр тэатра імя Я. Купалы. Раскажыце аб рабоце тэатра, яго тэатральнай трупе, апошніх спектаклях тэатра.

— Вы — акцёр Шэкспіраўскага тэатра. Раскажыце аб рабоце тэатра. Раскажыце, над чым Вы зараз працуеце, з якімі цяжкасцямі сутыкаецеся і інш.

Вышэйпрыведзеныя заданні пры навучанні гутарковай мове прымушаюць студэнтаў думаць, разважаць і знаходзіць аптымальнае рашэнне. Абавязкова пры складанні заданняў трэба ўлічваць спецыялізацыю студэнтаў.

Сістэматычнае выкарыстанне заданняў праблемнага характару з'яўляецца эфектыўным сродкам кіравання пазнавальнай дзейнасцю студэнтаў у навучальным працэсе; дапамагае стварыць ўмовы для творчага выкарыстання атрыманых ведаў, уменняў і навыкаў у новых абставінах. Заданні станоўча ўплываюць на развіццё інтэлектуальных уменняў (параўнанне, аналіз, вызначэнне галоўнага, абагульненне, канкрэтызацыя) і вучэбных уменняў (пастаноўка мэты, планаванне будучай дзейнасці, вызначэнне спосабаў дасягнення мэты, самакантроль): садзейнічаюць ўсведамленню студэнтамі прыкладнога характару атрыманых тэарэтычных ведаў, неабходнасці звязваць іх з прафесійнай дзейнасцю.

**Зубра А.С.,**
*прафесар*

# ФІЛАСОФІЯ РАЗВІЦЦЯ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТА УНІВЕРСІТЭТА КУЛЬТУРЫ

Развіццё здольнасцей студэнта заўседы цесна звязана з тымі сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі, у якіх яно адбываецца, з сістэмай адукацыі. Сёння, абмяжоўваючыся простым узнаўленнем мінулага вопыту і даючы студэнтам «шматковыя» веды пад націскам інфармацыйнага буму, сістэма вышэйшай адукацыі перастала служыць творчай асновай для развіцця здольнасцей студэнта, яго самарэалізацыі і самасцвярджэння. Ва універсітэце многія студэнты вучацца абы-як, толькі б паспяваць на тройкі і атрымаць дыплом. А адбываецца гэта таму, што набыццё вышэйшай адукацыі большасць студэнтаў успрымаюць як механічны працэс, незалежна ад здольнасцей. Вынік такіх аблегчаных адносін да навучання - зніжэнне якасці вышэйшай адукацыі, марнаванне часу і сродкаў. Пры гэтым ва ўмовах эканамічнага крызісу ніхто не нясе адказнасці за гэта. «Кадры вырашаюць усё!» — той лозунг, які прадвызначыў знікненне адукацыі як феномена культуры, патрэбнасці асобы ў вышэйшай адукацыі як аднаго са спосабаў развіцця здольнасцей і ўдасканалення культуры асобы. Усё гэта не задавальняе сённяшняе грамадства.

Вышэйшая адукацыя, зарыентаваная на дасягненне вузкапрагматычнай мэты - падрыхтоўку спецыялістаў, прывяла да таго, што з ВНУ знік дух пошуку, смелага парывання. Ва універсітэт прыйшло жыццё, пазбаўленае яскравых фарбаў, якія робяць яго прывабным для студэнта. Агульная глабальная мэта, звязаная з падтрыманнем культа культуры, распалася на мноства дробных, прыватных мэт: атрымаць дыплом, заняць пасаду, прасунуцца па рабоце і інш..

З чаго трэба пачынаць, каб змяніць становішча? З пастаноўкі мэты, бо без мэты нельга паспяхова развіваць здольнасці студэнтаў. Гаворка ідзе аб неабходнасці змены



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ